# СЦЯГ БРЫГАДЫ І ГАДЗІННІК МАРШАЛА БАГРАМЯНА

**Фонды Дзяржаўнага музея ваеннай гісторыі Беларусі пастаянна папаўняюцца новымі экспанатамі. Сярод іх ёсць унікальныя для нашай краіны рэчы. Але і сам музей ладзіць перасоўныя інтэрактыўныя выстаўкі, якія не падобны на класічны фармат. Як жа гэта робіцца? Аб гэтым — наша гутарка з дырэктарам музея Сяргеем АЗАРОНКАМ.**



## «Усе выстаўкі мы ладзім на бясплатнай аснове»

— 2019-ы прайшоў пад знакам 75-годдзя вызвалення Беларусі. Наступны год — таксама знакавы. Будзе святкавацца тры чвэрці стагоддзя ад даты перамогі над нацысцкай Германіяй. Што падрыхтаваў музей да гэтых дат?

— Не магу не згадаць праект «Беларусь памятае». Вось ужо чатыры гады мы праводзім акцыю «Памятаем. Ганарымся». 95 % выставак, арганізаваных у яе межах, прайшлі ва ўсіх буйных краязнаўчых музеях краіны, апрача сталіцы. Прычым асноўны ўпор быў зроблены на Мінскую вобласць. Самі выстаўкі ў нас інтэрактыўныя і падзелены на дзве часткі. Спярша перад школьнікамі выступаюць колішнія сыны палкоў, остарбайтары і тыя, хто ацалеў, будучы дзіцем падчас халакосту. А другую палову выстаўкі ствараюць самі дзеці. Хтосьці прыносіць баявыя фатаграфіі, узнагароды сваіх прадзедаў і прабабуль. Іншыя дзеляцца ўспамінамі, якія гучалі ў сям'і, ствараюць малюнкі са сваёй інтэрпрэтацыяй тых падзей. І такім чынам, мы адыходзім ад класічнага фармату, калі экскурсавод чытае лекцыю па экспазіцыі. Так у нас ужо пабывала больш за 30 тысяч школьнікаў. І ўсе выстаўкі мы ладзім на бясплатнай аснове. Інакш гэта было б мінімум неэтычна. Уявіце сабе сітуацыю — школьнік за грошы сваіх бацькоў расказвае пра подзвіг свайго прадзеда. У галаве такое не ўкладваецца!

Акцыя «Памятаем. Ганарымся» была намінавана на Магілёўскім нацыянальным музейным форуме на найлепшы экспазіцыйна-выставачны музейны праект. Сярод 80 іншых імпрэз яна заняла першае месца. Прадстаўнікі музея праводзілі яе і ў Маскве — на ВДНГ і ў Маскоўскім дзяржаўным універсітэце.

## На гадзінніку — час пачатку аперацыі

— Перш чым прэзентаваць любы экспанат, яго трэба займець і ўнесці ў адпаведныя каталогі. Якімі цікавымі прадметамі папаўняюцца фонды музея?

— За апошнія два гады да нас паступілі сапраўды ўнікальныя рэчы. Напрыклад, Ніна Сычова, дачка Сцяпана Манковіча, які быў камісарам партызанскай брыгады «Жалязняк» у Бягомльска-Барысаўскай партызанскай зоне, прынесла да нас... сцяг гэтага фарміравання народных ваяроў. Сімволіка, якая доўгія гады лічылася страчанай, вярнулася назад дзякуючы выпадку. Неяк дачка вырашыла перабраць стары чамадан з рэчамі свайго бацькі. І вось сярод мноства іншых рэчаў, сёе-тое з якіх таксама пасля патрапіла ў музей, і знайшоўся беражліва загорнуты сцяг. Вось толькі час яго не пашкадаваў — амаль 70 гадоў прывялі палатно ў вельмі кепскі стан. З-за сырасці амаль цалкам згніло мулінэ — гэтымі ніткамі ўручную вышывалі надпісы. Ды і край баявога сцяга таксама моцна абтрапаліся. Два рэстаўратары працавалі амаль чатыры месяцы над бясцэннай рэліквіяй. Спонсарам работы выступіла адна з вядомых беларускіх IT-кампаній, якая займаецца распрацоўкай камп'ютарных гульняў на тэму Другой сусветнай вайны. І сёлета на парадзе да Дня Незалежнасці сцяг быў урачыста пранесены перад трыбунамі.



❍ **Даведка «Звязды».** *Брыгада «Жалязняк» адметная тым, што толькі гэтае партызанскае злучэнне мела ўласны аэрадром, які мог прымаць на пасадку цяжкую авіяцыю. Калі ўлічыць, што тая мясцовасць вельмі балоцістая, а побач знаходзіцца Бярэзінскі біясферны запаведнік, то трэба прызнаць, што месца для аэрадрома было выбрана надзвычай удала. Туды прыляталі самыя буйныя тагачасныя савецкія ваенна-транспартныя самалёты Лі-2. У памяць пра гэта на ўездзе ў Бягомль усталявана самалёт.*

На падкантрольнай «Жалязняку» тэрыторыі амаль увесь час вайны віселі чырвоныя сцягі на будынках мясцовых сельсаветаў. Знікалі яны літаральна на некалькі гадзін, калі падчас чарговай аблавы атрады нямецкіх захопнікаў займалі паселішчы. А калі нацысты здымаліся з месцаў, то са схованак зноў даставалі чырвоныя сцягі. Так Бягомльскі раён і заставаўся невялічкай савецкай рэспублікай.



А вось у пачатку года да нас завітаў кіраўнік Федэральнай нацыянальна-культурнай аўтаноміі Сяргей Кандыбовіч. Ён нам перадаў рарытэт, якога ў краіне больш няма — сапраўдны кіцель Сталіна. Праўда, ланцужок, якім гэты кіцель да нас дайшоў, вельмі пакручасты. Вядома толькі, што гэты кіцель спярша захоўваўся ў сям'і асабістага шафёра Сталіна. Затым нейкім чынам ён трапіў у прыватную калекцыю былога камандуючага Прыкарпацкай ваеннай акругай...

Летась мы ладзілі выстаўку на Віцебшчыне. Туды прыйшлі ўнукі маршала Баграмяна і перадалі нам гадзіннік свайго славутага дзеда, з якім ён прайшоў праз ваеннае ліхалецце. Гэты гадзіннік сваімі габарытамі нагадвае кішэнны, але выкананы ён як наручны. Прычым надзейнасць яго вельмі вялікая. Цікава, што ў той час афіцэры ўласных гадзіннікаў не мелі. Яны каштавалі вельмі дорага. Таму іх выдавалі ў якасці аднаго з кампанентаў ваеннай формы — як, напрыклад, боты або гімнасцёрку. І так атрымалася, што гадзіннік маршала Баграмяна паказвае якраз час, калі пачалася артылерыйская падрыхтоўка падчас вызвалення Гарадка, што знаходзіцца ў Віцебскай вобласці.

## У пошуках экіпажа самалёта

— Наколькі вялікую дапамогу аказваюць музею ваенныя пошукавікі?

— Пад Столінам у балоце яны знайшлі аскепкі ад самалёта Іл-4. Звярнуліся да нас з просьбай высветліць, што ж за экіпаж быў у апошнім рэйсе... Зрабілі запыт у Цэнтральны архіў Міністэрства абароны Расіі, паколькі там сабраны ўсе звесткі пра дзейнасць воінскіх фарміраванняў і злучэнняў падчас Вялікай Айчыннай вайны. Перадапошняя лічба нумара матора захавалася дрэнна. Мы так і не зразумелі — ці адзінка гэта, ці нулік. Аказалася, што гэта быў не класічны Іл-4, а адна з яго эксперыментальных разнавіднасцяў, якіх выпусцілі ўсяго 20 штук. Самалёт, нумар матора якога заканчваўся на «19», быў у страі да чэрвеня 1945 года. А вось машына, у якой дзве апошнія лічбы на маторы значыліся як «09», з задання не вярнулася. Засталіся звесткі пра экіпаж, які 2 ліпеня 1944 года пераляцеў цераз лінію фронту. Два пілоты — Жуган і Кураедаў, стралок-радыст Асмачка і бортінжынер Ергін. Але зноў жа, гэтыя прозвішчы ўнесены ў дакументы, але ці менавіта гэтыя людзі адправіліся ў рэйс? Тым больш што не ўсё зразумела і па палётным заданні — да пункта прызначэння той Іл-4 не даляцеў прыкладна з паўсотні кіламетраў. І вось толькі журнал аднаго з гвардзейскіх фарміраванняў дапамог крыху праліць святло на гэтую гісторыю. Самалёт даў апошнюю радыяграму, прайшоўшы Пінск у 23.02. Пасля гэтага яго атакавалі два нямецкія «Месершміты». Стралок-радыст Асмачка ўступіў у няроўны бой, але неўзабаве быў смяротна паранены нямецкай куляй. Іншыя лётчыкі ўсе трое катапультаваліся. Жуган і Кураедаў у рэшце рэшт трапілі ў адзін з партызанскіх атрадаў, а вось куды падзеўся Ергін, так і невядома. Вось такую гісторыю хаваюць за сабой кавалкі перакручанага ад удараў металу, якія калісьці складалі фюзеляж самалёта...

Аскепкі яшчэ аднаго самалёта — Ла-5 — былі падняты з балота пад Светлагорскам. Пакуль што высвятляецца, хто менавіта адправіўся на ім у апошні рэйс. Сяргей Азаронак паказвае на тэлефоне фотаздымкі перакручанай бронеспінкі сядзення камандзіра экіпажа, якую выбуховая хваля перакруціла да непазнавальнасці. А што ж было з чалавекам, якога гэтая спінка мусіла прыкрываць?




* * *

Музей ваеннай гісторыі неўзабаве зменіць сваю назву. Цяпер яна будзе гучаць як «Музей гісторыі Узброеных Сіл Беларусі». Што ж хаваецца за гэтай рэформай? Сутнасць музея не зменіцца — яго профілем як была ваенная гісторыя, так і застанецца. Але больш пільная работа будзе праводзіцца менавіта з усім тым, што звязана з найноўшай гісторыяй Беларусі.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
**Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.**

## Сербскі напрамак

У пачатку гэтага тыдня Бялград наведала беларуская ваенная дэлегацыя на чале з начальнікам Дэпартамента міжнароднага ваеннага супрацоўніцтва — памочнікам міністра абароны па пытаннях міжнароднага ваеннага супрацоўніцтва генерал-маёрам Алегам Воінавым. Там адбыліся кансультацыі абаронных ведамстваў Беларусі і Сербіі па планаванні ваеннага супрацоўніцтва ў надыходзячым годзе. Быў падпісаны адпаведны план.

Бакі абмеркавалі стан і перспектывы ўзаемных кантактаў, абмяняліся думкамі аб стане і прагнозах развіцця ваенна-палітычнага становішча ў еўрапейскім рэгіёне і свеце, а таксама падвялі вынікі ваеннага супрацоўніцтва сёлета.

Акрамя таго, прадстаўнікі Міністэрства абароны Беларусі сустрэліся з кіраўніком абароннага ведамства Сербіі Аляксандрам Вуліным і начальнікам Генеральнага штаба Узброеных сіл генералам Міланам Майсілавічам.